ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 821.161.3.09-1 «1921/1939»
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-2-149-159

Паступіў у рэдакцыю 28.02.2024
Received 28.02.2024

**М. У. Мікуліч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ЗАБЫТЫЯ ПАЭТЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Аннотация.** Статья посвящена осмыслению идейно-художественных поисков забытых поэтов Западной Беларуси – Петруся Гранита, Юльяна Сергиевича и Кастуся Рагойши, которые осуществлялись в рамках ведущего лирико-повествовательного художественно-стилевого течения. Автор выявляет заангажированность лирического героя П. Гранита в актуальные проблемы западнобелорусской действительности, остроту его социального взгляда, характерную наступательность, которые раскрывали объективную природу явлений и процессов, как правило, связанных с конкретным хронотопом. Подчеркиваются разнообразие проблемно-тематического содержания, возвышенность духовно-морального мира, широкий спектр образно-стилевого рисунка творчества Ю. Сергиевича, в стихах которого христианско-религиозная идея органически сопрягалась с мотивами борьбы с несправедливостью и угнетением. В творчестве К. Рагойши внимание акцентируется на синтезе элементов нарративного и проблемного, аналитического письма, которое характеризовалось авторской наблюдательностью, умением заметить и подчеркнуть в явлении и предмете индивидуальное, неповторимое, показать их в движении, развитии.

**Ключевые слова:** традиции, творческая индивидуальность, лирико-повествовательный, образ, духовно-социальный, реалистическое отражение, лирический герой, предметно-изобразительный

**Для цитирования:** Мікуліч, М. У. Забытыя паэты Заходняй Беларусі / М. У. Мікуліч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2024. – Т. 69, № 2. – С. 149–159. https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2024-69-2-149-159

**Mikalai U. Mikulich**

*Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## FORGOTTEN POETS OF WESTERN BELARUS

The article is devoted to the comprehension of the ideological and artistic searches of the forgotten poets of Western Belarus Petrus Hranit, Yulian Serhievich and Kastus Rahoysha, which were carried out within the framework of the leading lyrical and narrative artistic and stylistic current. The author reveals the involvement of the lyrical hero P. Hranit in the current problems of the West. Hranit's involvement in the actual problems of the West Belarusian reality, the acuteness of his social view, the characteristic assertiveness, immobilisation of the poet's poems, which revealed the objective nature of phenomena and processes, as a rule, connected with a specific chronotope, emphasises the variety of problem-thematic content, the elevation of the spiritual and moral world, the wide range of imaginative and stylistic pattern of Y. Serhievich's work, in which the Christian religious idea was organically combined with the motives of the struggle against injustice and oppression. The poetry of K. Rahoysha emphasises the synthesis of elements of narrative and problematic, analytical writing, which was characterised by the author's observation, the ability to notice and emphasise the individual, unique in phenomena and objects, to show them in movement and development.

**Keywords:** traditions, creative individuality, lyric and narrative, image, spiritual and social, realistic reflection, lyrical hero, figurative and visual

**For citation:** Mikulich M. U. Forgotten Poets of Western Belarus. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2024, vol. 69, no. 2, pp. 149–159 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-2-149-159

**Уводзіны.** XX стагоддзе – адно з самых цікавых і плённых у развіцці беларускай нацыянальнай літаратуры. Вывучэнню гэтага перыяду прысвечаны шматлікія навуковыя працы, у тым ліку фундаментальная акадэмічная "Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя" ў 4 тамах 6 кнігах, даследаванні асноўных праблем і напрамкаў, родаў і жанраў, творчасці вядучых пісьменнікаў і інш. Аднак было б памылковым лічыць, што тут абсалютна ўсё зроблена, належным чынам асэнсавана, зусім не засталося "белых плямаў" і нявырашаных праблем.

Па часе выяўляюцца і ўваходзяць ва ўжытак усё новыя і новыя мастацкія тэксты і дакументальныя матэрыялы, якія дапаўняюць, а то і зусім мяняюць аблічча асобных этапаў і чыннікаў

© Мікуліч М. У., 2024

літаратурнага працэсу і патрабуюць свежых навуковых падыходаў і канцэптуальных рашэнняў, істотных удакладненняў і карэктываў.

Менавіта да такіх этапных і арыгінальных з'яў нашай нацыянальнай літаратурнай гісторыі належыць паэзія Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., у развіцці якой з цягам часу адкрываюцца ўсё новыя і новыя або забытыя старонкі, асобы, матэрыялы.

**Асноўная частка.** Прадметам нашага аналізу з'яўляецца творчасць цалкам забытых сёння заходнебеларускіх паэтаў Петруся Граніта (1909–1980), Юльяна Сергіевіча (1909–1976) і Кастуся Рагойшы (1921–1964).

Пятрусь Граніт (сапр. Іван Пятровіч Івашэвіч) нарадзіўся 11 студзеня 1909 г. у вёсцы Зачэпічы Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці) у беднай сялянскай сям'і. Магчымасці атрымаць добрую адукацыю ў прагнага да ведаў, здольнага хлопчыка не было – вучыцца давялося толькі ўрыўкамі ў выпадковых настаўнікаў, галоўным чынам па зімах, калі змяншалася інтэнсіўнасць працы па гаспадарцы. П. Граніт скончыў 4 класы польскай школы, вучыўся на шаўца, быў рознарабочым. Пад уплывам грамадскіх настрояў і народна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі далучыўся спачатку да грамадска-культурных мерапрыемстваў Беларускай сялянска-работніцкай грамады, а пасля да рэвалюцыйнага падполля. У 1930 г. уступіў у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Удзельнічаў у закладцы партыйных ячэек, распаўсюджваў забароненую літаратуру сярод насельніцтва, выступаў на дэманстрацыях, мітынгах пратэсту, сходах супраць сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці і прыгнёту, за беларускую школу, іграў у спектаклях, пастаўленых па творах Я. Купалы, М. Чарота, Л. Родзевіча і інш. У сувязі з гэтым неаднаразова арыштоўваўся польскай паліцыяй і падвяргаўся катаванням і здзекам у пастарунках.

Цікавіцца літаратурай і пісаць вершы П. Граніт пачаў пад уплывам падзей нацыянальна-вызваленчай барацьбы і пры падтрымцы вядомага палітычнага і грамадска-культурнага дзеяча Ігната Дварчаніна, з якім быў добра знаёмы. Першы верш "Лета" апублікаваў у "Беларускай газеце" 10 жніўня 1933 г. Друкаваўся ў часопісах і газетах "Летапіс ТБШ", "Шлях моладзі", "Наша воля", "Асва" і іншых, штотыднёвіку "Poprostu".

У 1939 г. падрыхтаваў да выдання зборнік вершаў "Над хвалямі Нёмана", які ў сувязі з ваеннымі падзеямі не выйшаў.

Як і большасць тагачасных паэтаў, П. Граніт належаў да вядучай у заходнебеларускай літаратуры наратыўнай, лірыка-апавядальнай мастацка-стылявой плыні, якая жывілася энергіяй шырокіх пластоў насельніцтва, галоўным чынам сацыяльных нізоў грамадства, іх настроямі і перажываннямі. Паэты гэтай плыні Г. Леўчык, С. Станкевіч, Улад. Ініцкі, Ф. Грышкевіч, М. Засім, Н. Тарас і інш. сцвярджалі матывы цяжкога лёсу роднага краю, гаравітай долі беларуса, беднасці вясковага існавання, адлюстроўвалі будзённыя клопаты і турботы селяніна, асаблівасці яго маральна-практычнага ўкладу жыццядзейнасці, бязрадаснай, знясільваючай працы на гаспадарцы. У вершах П. Граніта пераважалі карціны цяжкай працы селяніна і рабочага, людской нядолі, нялёгкага народнага побыту і нястач ва ўмовах несправядлівасці і прыгнёту. "І чысціцца плуг у скібах раллі, / Ратай потам скрапляе загоны, – чытаем у адным з іх. – Дні цяжкае працы ізноў паплылі, / І падсвістае вецер шалёны". Яны звярталі на сябе ўвагу найперш праўдай перажытага, натуральнасцю лірыка-апавядальнага дыскурсу, шчырасцю і цеплынёй вобразна-метафарычнага малюнка:

Адгулялі серп з касою,
ўсе палеткі адцвілі,
ўсё панеслі за сабою
ў сінім небе жураўлі.

Смуткам глянула ў вочы
чорна-шэрая ралля,
паказала твар сірочы
спрацаваная зямля.

*("Адгулялі серп з касою...")*

Змрочны, прыгнечаны стан лірычнага героя П. Граніта, вядома, найперш выяўляецца ў адметным характары яго светабачання і логіцы мыслення. Дрэвы ў паэта стаяць з абгалелымі галінамі, вецер грае панурыя гімны, Краіна забытая, разгулялыя ветры топяць "яснае сонца у хмарах, / Па снегам пакрытаму полю / Шалеюць у белых туманах". "Дні волавам цяжкім павіслі / Над вёскамі стрэх саламяных…", "Зімовыя сцюжы і ветры / Аб долі іх песні складаюць…" ("Зімовыя дні").

Нават, здавалася б, вельмі далёкі ад грамадска-сацыяльных праблем і супярэчнасцей лірыка-апавядальны дыскурс П. Граніта пейзажнага характару паступова так ці інакш скіроўваецца да вострых драм і трагедый заходнебеларускай рэчаіснасці:

І з-за лесу, гораў выплыў ясны месяц
і стаў гаспадарыць над палямі, лесам.
Загарэліс іскры на снежных раўнінах,
сыпнуліся зоры на лясы, даліны.

І каротка рэха ціха замірае,
зорным срэбрам месяц вёскі залівае
ды крадзецца ціха каля хат вясковых,
хоча ён паглянуць на галодных, голых.

*("Зімовая ноч")*

Радкі звяртаюць на сябе ўвагу сваёй вобразнай адметнасцю, характэрнай індывідуальна-аўтарскай самавітасцю, паэзіятворчае майстэрства П. Граніта тут відавочнае.

Пры ўсім гэтым у параўнанні, напрыклад, са сваімі папярэднікамі нашаніўцамі паэт сведчыў пра актыўнасць асваення складаных працэсаў грамадскага жыцця, адлюстравання прыроднага свету, выяўлення ўнутранага стану асобы. У яго творах агульнае, калектыўнае прадугледжвала існаванне асобнага. Такія вершы П. Граніта, як "Брукар", "Песня каваля" і іншыя, характарызаваліся вастрынёй сацыяльнага погляду, наступальнасцю. Яны раскрывалі аб'ектыўную прыроду з'яў і рэчаў, сапраўдную сутнасць падзей і фактаў, як правіла, звязаных з канкрэтным хранатопам, зусім пэўнымі і выразнымі сацыяльнымі ўмовамі і абставінамі жыцця і часу. Што істотна важна, у іх гучалі ідэі духоўна-сацыяльнага і нацыянальна-культурнага абуджэння асобнага чалавека і ўсяго народа краю, кансалідацыі грамадскіх сіл з мэтай супрацьстаяння прыгнёту, якія сведчылі аб сацыяльным аптымізме.

Як гэта выяўлялася? Малады паэт не проста назірае, бачыць тую ці іншую з'яву, падзею ці працэс, а ўмее ўзняцца над імі, даць ім ідэйна-мастацкую афарбоўку, раскрыць яе ў святле актуальных грамадска-палітычных варункаў. Да прыкладу, будзённую працу звычайнага брукара ён насычае асаблівым духоўна-сацыяльным зместам: брукар не проста "Хоча шлях пракласьці новы, / Каб не раніць людзям ног", а "молатам сталёвым / Звоніць, б'е па камянёх", як той волат, высякае молатам агонь. Такім чынам ён не проста брукуе дарогу-вуліцу, а "Пракладае новы шлях":

Новы шлях прамы і роўны,
Каб не раніць болей ног.
Па ім пойдзе люд працоўны
Да сьвятла і перамог.

*("Брукар")*

Звяртаюць на сябе ўвагу адметныя слоўна-вобразныя адзінкі паэта: камяні, молат сталёвы, шлях новы, "мазалістая далонь", волат, агонь, рэха, іскры, святло перамогі. Вельмі цікавая думка пра верш П. Граніта "Брукар" належыць У. Калесніку: "Ёсць у ім нешта з песень працы Цішкі Гартнага. Сам Граніт вымушаны быў улетку брукаваць дарогі, бо гаспадарка не давала належных сродкаў на пражытак. Паэт ведаў настроі і думы пралетарскіх пластоў заходнебеларускай вёскі і ў сваіх баявітых публіцыстычных вершах шчыра і востра выказваў іх кроўныя інтарэсы.

Праўда, вершам брукара не хапала паэтычнай тэхнікі, многія з іх кампазіцыйна расцягнутыя, стракацяць рыторыкай, агульнымі мясцінамі, шурпатыя па гука-меладычнай структуры, але пры ўсім гэтым шчырыя і праўдзівыя, як жывы голас чалавека, як балючы крык душы, таму захоўваюць каштоўнасць калі не эстэтычную, дык гісторыка-дакументальную" [1, с. 251–252]. І з гэтым цяжка не пагадзіцца.

П. Граніт складае песню-гімн шчыраму, апантанаму працаўніку і яго стваральнай працы, на якой трываліцца не толькі матэрыяльны дабрабыт асобнага чалавека, але і духоўна-сацыяльная жыццядзейнасць народа:

Ад працы цяжкое
Ты рук не хавай.
Хоць змучаны, стомлены, –
Песьні сьпявай.
…………………………
Ці чуеце песьню,
Палі і лясы,
Аб лучнасьці цеснай
Сярпа і касы?!

*("Ад працы цяжкое...")*

Гэта фактычна песня-гімн нялёгкай сялянскай долі беларуса і беларускі, іх еднасці.

У многіх вершах П. Граніта, дарэчы, як і іншых заходнебеларускіх аўтараў, на ўзор дарэвалюцыйных твораў класікаў Я. Купалы і Я. Коласа, вобраз працы напаўняецца глыбокім духоўна-сацыяльным зместам, сімвалізуецца, асацыіруецца з барацьбой за лепшую долю, з вызваленнем і шчаслівым будучым. Індывідуальны, асобасны пачатак у іх узбуйняецца, вырастае да масавага, агульнанароднага:

Мой палае горан яркі,
Іскры золата гарацьь.
Заклікае молат цяжкі
Долю лепшую каваць.

Зьвініць молат на кавадле,
Гне жалеза, плыве пот.
Працай дружнай і заядлай
Долю выкуе народ.

*("Песня каваля")*

Так, чалавека можна пазбавіць свабоды, скаваць яго рукі і ногі, сцвярджае лірычны герой верша П. Граніта "Калі супачыну душою", але заняволіць свет яго думак і пачуццяў, мар і імкненняў немагчыма. "Паны не адкрылі "навукі", / Каб думку магла запыняць", – чытаем у вершы. – "Чым болей прынукі, няволі, / Тым думка яскравей гарыць":

Калі супачыну душою
І скіну няволі цяжар?
Тады, як ўзьляціць над зямлёю
Агніста-чырвоны штандар! [2, с. 261].

Мы бачым, што лірычны герой П. Граніта характарызуецца бадзёрасцю духу, аптымістычным настроем, верай у перамогу высілкаў патрыятычна настроенай моладзі. У вершы "Кінь нуду і бяду!" ён заклікае:

Кінь нуду і бяду,
Сонцу ў вочы глядзі
І да мэты сваёй
Ўсё пярэднім ідзі!.. [3, с. 23].

Паэт цвёрда верыць у тое, што “прыйдуць дні другія, / Прыйдуць з полымем гарачым, – / І стары падмінаваны / Затрасецца сьвет іначай” (“Свет трасецца навакола…”). Беларус у яго вершах паўстае як цалкам добразычлівая, дружалюбная, памяркоўная асоба, сціплы, спакойны, працавіты чалавек, часам з хітрынкай, кемлівы, дасціпны, верны свайму грамадзянска-патрыятычнаму абавязку. Ён шмат працуе, многае церпіць, “жыве невясёла”, пакутуе, але да пэўнай пары. Яго цярпенне не бясконцае. Гэта свабодалюбівая, крэатыўная натура, якая ведае сабе цану і неўзабаве даб’ецца сваёй мэты.

Вершы П. Граніта вызначаліся свежасцю адчування з’яў і працэсаў, характэрнай адметнасцю вобразна-метафарычнага мыслення. Паэт умеў заўважыць, як “Вясна снуе шаўковай пражай кросны / і сонца золатам абрус узорны тчэ”, як “сад бельлю пеніцца, бы іней ад марозу, / то краскі пырскаюць на зямлю малаком” (“Вясна”).

Падчас Вялікай Айчыннай вайны П. Граніт актыўна ўдзельнічаў у антыфашысцкім руху супраціўлення, у змаганні з ворагам, быў сувязным партызанскай брыгады «Барацьба». Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў скончыў Навагрудскае педагагічнае вучылішча (1950), працаваў настаўнікам, дырэктарам пачатковай школы ў Зачэпічах.

Падборкі вершаў П. Граніта змяшчаліся ў калектыўных зборніках “Сцягі і паходні” (1965), “Ростані волі” (1990), у рэспубліканскім друку. У 1978 г. выйшаў зборнік вершаў паэта для дзяцей “Сцяжынка”.

Сваімі адметнымі шляхамі-дарогамі ішоў у літаратуру Юльян Сергіевіч. Нарадзіўся ён 5 жніўня 1910 г., а не 23 верасня, як памылкова падаюць многія нашы даведнікі, у тым ліку і біябібліяграфічны слоўнік “Беларускія пісьменнікі” [4, с. 303], у вёсцы Юраўшчына Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) у беднай шматдзетнай сялянскай сям’і. Магчымасці атрымаць добрую адукацыю ў будучага паэта не было – патрэбна было дапамагаць бацькам “здабываць хлеб надзённы” [5, с. 145]. Закончыў Ленкаўскую пачатковую школу, займаўся самаадукацыяй, працаваў на гаспадарцы. У 1932–1933 гг. як грамадзянін Польшчы Ю. Сергіевіч служыў у польскім войску, пазней вучыўся на сельскагаспадарчых курсах. Браў актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах Беларускай сялянска-работніцкай грамады і Таварыства беларускай школы, выступаў у якасці акцёра ў самадзейных спектаклях народных калектываў, пісаў для іх сцэнарыі і інш. У жніўні 1939 г., перад пачаткам Другой сусветнай вайны, Ю. Сергіевіч быў мабілізаваны ў польскае войска. 5 верасня таго ж года ў баях пад Петраковам трапіў у нямецкі палон. Да 20 лютага 1941 г. знаходзіўся ў розных фашысцкіх канцлагерах, у адным з якіх пазнаёміўся і пасябраваў з заходнебеларускімі літаратарамі Міхасём Васільком і Янкам Брылём. Пазней як “остарбайт” служыў на тартаку ў нямецкага баўэра ў мястэчку Прэсат, што ў Баварыі.

Пасля вызвалення Ю. Сергіевіч працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Ленкаўшчыне. У 1946 г. быў беспадстаўна арыштаваны органамі НКУС, абвінавачаны і асуджаны на 10 гадоў ссылкі, якую адбываў ў сталінскіх лагерах на Поўначы, у Сібіры і Казахстане.

Вярнуўшыся на радзіму, пасля рэабілітацыі жыў у Ленкаўшчыне, працаваў у калгасе імя У. І. Леніна, займаўся сялянскай гаспадаркай.

Пісаць невялікія карэспандэнцыі ў газеты і вершы Ю. Сергіевіч пачаў вельмі рана, фактычна ледзь толькі авалодаўшы асновамі граматы. Першы яго верш пад назвай “Дуб” быў змешчаны ў 1922 г. не ў “віленскім выданні “Беларускі звон”, як тое адзначаў вядомы культуролаг, фалькларыст і краязнаўца Г. Каханоўскі [5, с. 145], а ў часопісе беларускай моладзі “Маладое жыццё”. Дарэчы, змешчаны за подпісам Юлік Сергіевіч і з характэрнай рэдактарскай спасылкай-удакладненнем: “Верш 10-гадовага вучня Ленкаўскае Беларускае пачат. школы” [6, с. 19]. У ім юнаму паэту ўдалося стварыць даволі цікавы, цёплы, прывабны вобраз волата-дуба.

Ю. Сергіевіч друкаваўся ў віленскіх часопісах “Маланка”, “Шлях моладзі”, у калектыўным зборніку “Рунь веснаходу” (1928), некаторых іншых выданнях. У 1939 г. паэт падрыхтаваў да публікацыі свой персанальны зборнік вершаў, аднак у сувязі з ваеннымі падзеямі ён не выйшаў.

У сваёй ранняй творчасці Ю. Сергіевіч працягваў традыцыі нашаніўскай паэзіі, яна была прасякнута цяжкімі думкамі, самотна-тужлівымі перажываннямі, адлюстраваннем класава-сацыяльных праблем і супярэчнасцей заходнебеларускай рэчаіснасці, выяўленнем “мастацкай

канцэпцыі гаротнасці роднага краю” (І. Багдановіч). Герой паэта знаходзіўся ў стане духоўна-сацыяльнай прыгнечанасці, выяўлення скаргаў і нараканняў на несправядлівасць грамадскіх парадкаў і горкую жыццёвую долю:

Вёска панурая, вёска маркотная,
Многа ты лет пражыла!..
Ці адмянілася ж доля гаротная?
Ці прыбыло тут святла?

Ці завітала тут шчасце чаканае
Пачуццём светлых надзей?
Ці адбылося тут што спадзяванае
Сярод гаротных людзей?.. [7, с. 23].

Разам з тым пад уплывам народна-патрыятычнага руху ў краі і ўдзелу ў ім самога паэта яго творчасць паступова набывала аптымістычныя матывы, насычалася светлымі, бадзёрымі інтанацыямі, вобразамі вялікага часу, грамады, вольнага клічу, сходу, стальнога ўдару, працы, гулкага звону, шчасця чаканага, іскрыстага небазору. У ёй пачынаюць гучаць заклікі да грамадзянскага і нацыянальна-патрыятычнага абуджэння і кансалідацыі дэмакратычных сіл, шырокіх працоўных мас, да бою “за волю нашых родных хат, / за Край радзімы свой!”:

Вялікі час!.. Устань, народ!..
Ударыў гулкі звон!
Ідзі грамадамі на сход,
спяшай з усіх старон!
…………………………
Ідзі туды, адкуль чуваць
прызыўны, вольны кліч,
дзе волю новую каваць
пачаў сабе крывіч! [7, с. 36].

Ю. Сергіевіч адстойваў каштоўнасці партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”. У вершы “Устань, народ!..” ён сцвярджаў ідэі незалежнага развіцця Беларусі. У справе сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння беларусаў лірычны герой паэта вялікія надзеі ўскладаў на моладзь, на сыноў вёскі, якія не дадуць яе ў крыўду, не пакінуць у бядзе беларускі народ. Сярод іх ён, зразумела, бачыў і самога сябе:

Хто цябе узбудзіць, вёска?
Хто пакліча да з’яднання?
Хто пакажа вольны, просты
Шлях да сонца, да світання?
Хто прагоніць твае сны?
Гэта мы! Гэта мы!

Мы бачым, лірычны герой паэта – натура паслядоўная, моцная, мэтаімкнёная, валявая, настроеная на смелыя, рашучыя дзеянні. Яе сілкуюць ідэі свабоды роднага краю:

Я не змоўкну, бо мне думкі
Ўсюды голас падаюць,
Бо ўзоры і малюнкі
Родных вёсак песень ждуць.

Песень з імі аднатонных,
Зразумелых для усіх,
Песень вольных, не прыгонных,
Песень родных, не чужых [7, с. 46].

*(“Я не змоўкну...”)*

Ю. Сергіевіч валодаў моцнай сілай мастацкага ўяўлення. У вершы “Музыка” свае зрокавыя ўражанні ён удала паядноўвае са слыхавымі і падпарадкоўвае іх служэнню высокай грамадска-сацыяльнай мэце. Родная зямля выпраменьвае чароўную музыку: “Граюць гуслі-самагуды / Мілым тонам пераліўным, / Гэты звон чуваць усюды, / Вабіць гукам сваім дзіўным”. Паэт сцвярджае:

Звоняць гуслі-самагуды...
Гэты гучны звон-пяянне
Сыноў змучанага люду
Заклікае да яднання.

Хто пачуў той звон-пяянне,
Кроў адвагай закіпела;
Выйсці дружна на змаганне,
Стаць напроціў крыўды смела [7, с. 51].

Гэтая дзіўная музыка лагодзіць душу, суцяшае боль, лекуе раны. Яе чароўныя гукі закранаюць, бяруць пад абладу і лірычнага героя паэта, абуджаюць да жыцця яго песню. Ю. Сергіевіч не толькі развіваў традыцыйныя і звыклыя матывы цяжкога лёсу роднага краю, беднасці вясковага існавання, адлюстроўваў будзённыя клопаты і турботы селяніна, асаблівасці яго маральна-этычнага ўкладу жыцця, але і сведчыў пра ўзнёсласць мар і мэтаімкненняў, узвышанасць духоўна-маральнага свету лірычнага героя, вастрыню яго ідэйна-эмацыянальных поглядаў і ацэнак.

Цікавы, глыбокі, выдатны верш Ю. Сергіевіча “Вялікдзень”. У ім высокая хрысціянска-рэлігійная ідэя арганічна паядноўваецца з актуальным для жыцця беларускага народа сацыяльным матывам. Прыйшла вясна, а з ёю і вялікае народнае свята – Вялікдзень. З уваскрасеннем Хрыстовым паэт звязвае адраджэнне сваёй Радзімы – Беларусі:

Хрыстос уваскрос! Вось твой сімвал, народ мой гаротны,
І светлае праўды магутны, святы ідэал!
Паўстанеш ты целам і духам сваім несмяротным,
Адкінеш цяжары цябе прыгнятаючых скал.

Паўстанеш, бо толькі надзеі і веры нам трэба,
А светлая праўда жыла і жыве сярод нас.
Сягоння ж прарочыць пагоднае яснае неба
Для роднай краіны святога Вялікадня час.

Здзейсніцца цуд, трэба верыць у гэта, сцвярджае паэт, і спакутаваны народ нарэшце вызваліцца ад пут, пазбавіцца “знявагі, няшчасця і слёз”, здабудзе свабоду і зажыве ў дастатку і шчасці:

І станецца цуд! Зажывуць і загояцца раны,
Мы выйдзем да шчасця жывыя і поўныя сіл!
Стаптаныя гоні ізноў будуць намі ўзараны,
А злыбядзь уся расцярушыцца ў порах і пыл!

Вялікдзень. Вясна. Тут жыццё і краса з перамогай.
Канец надышоў для знявагі, няшчасця і слёз.
І ты, Беларусь, ідучы справядлівай дарогай,
Паўстанеш, як з мёртвых калісьці Хрыстос уваскрос [7, с. 57].

У адрозненне ад твораў некаторых іншых паэтаў Заходняй Беларусі, асабліва прадстаўнікоў масавай самадзейнай плыні, у тым ліку П. Граніта і К. Рагойшы, вершы Ю. Сергіевіча звяртаюць на сябе ўвагу разнастайнасцю праблемна-тэматычнага зместу, даволі шырокім спектрам яго вобразна-стылявога выяўлення. Яны працягвалі традыцыі нацыянальнай рэалістычнай паэзіі,

лірыка-апавядальнага пісьма, часцей за ўсё будаваліся на аснове лагічна-паняційнага прынцыпу, прадметна-інфармацыйнай сутнасці вобразнага адлюстравання і былі звернуты да паказу сацыяльнага сэнсу з'яў і падзей. Разам з тым асаблівасці наратыўнага мастацкага дыскурсу, канкрэтна-гістарычнай аб'ектыўнасці апісанняў і характарыстык перапляталіся ў іх з даволі глыбокім пранікненнем у вострыя праблемы і супярэчнасці грамадскага жыцця, з драматызмам лірычнага мыслення і перажыванняў, сацыяльна-выкрывальным пафасам. Вершы выразнага грамадзянска-патрыятычнага зместу, прамоўніцкага характару ("Устань, народ!..", "Гэта мы", "Я не змоўкну…") суседнічалі ў Ю. Сергіевіча з прыродаапісальнымі, сацыяльна-бытавымі замалёўкамі ("Успаміны", "Вёска"). Глыбокія філасофска-медытатыўныя рэфлексіі і сентэнцыі ("Асеннія думкі", "Мары") дапаўняліся шматлікімі інтымнымі, напоўненымі тонкімі душэўна-псіхалагічнымі згадкамі і перажываннямі ("Ці могуць…", "Засохшая кветка"). Ён даволі паспяхова звяртаўся да хрысціянска-рэлігійнай праблематыкі, да тэмы паэта і паэзіі і інш. У цэлым мастацкая свядомасць Ю. Сергіевіча вызначалася сінтэзам эмацыянальна-пачуццёвага і наступальна-валявога кампанентаў, сцвярджэннем актыўных пачаткаў жыцця, цвёрдым адстойваннем ідэалаў праўды, высокай маралі, свабоды і справядлівасці.

Шмат у чым падобнымі шляхамі-дарогамі ішоў у літаратуру Кастусь Рагойша, які нарадзіўся ў снежні 1920 г. (дакладная дата невядомая) у вёсцы Пярэжары Валожынскага павета Вілейскага ваяводства ў дружнай і працавітай шматдзетнай сялянскай сям'і. Яго малодшая сястра Надзея ўспаміннала: "Каб не траціць год і не ісці хлопцу, калі падрасце, раней часу ў войска, яго запісалі 2 студзеня 1921 года" [8, с. 19].

Бацькі будучага паэта належалі да інтэлігентных, перадавых для свайго часу людзей, яны імкнуліся выхоўваць сваіх шасцёра дзяцей у павазе да старэйшых, клопаце пра бліжніх, у любові да роднай зямлі і працы на ёй, прывівалі ім цягу да ведаў, асветы, творчасці.

З ранніх гадоў Кастусь, бадай, як і кожны вясковец, рос у шматлікіх клопатах і турботах – дапамагаў бацькам па гаспадарцы, даглядаў малодшых у сям'і дзяцей, адольваў навуку чытаць-пісаць, складаць-адымаць, множыць-дзяліць. Ён закончыў Пярэжарскую пачатковую (чатырохкласную) школу, Ракаўскую сямігодку (1935), зарэкамендаваўшы сябе кемлівым, дапытлівым, прагным да ведаў і пазнання вучнем. Дзесьці ў 16–17-гадовым узросце здольнага да навукі і творчасці хлопца пацягнула да вершавання. Несумненна, у гэтым не толькі праявіліся яго асабістыя схільнасці і сімпатыі, але і сказаўся ўплыў папулярнай тады масавай самадзейнай паэзіі, якая была абуджана да жыцця ростам сацыяльнай і нацыянальнай самасвядомасці заходнебеларускага народа, развіццём патрыятычнага руху, актывізацыяй нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў краі.

Як П. Граніт і Ю. Сергіевіч, малады аўтар пісаў пра нялёгкае жыццё простых людзей, галоўным чынам сялян, пра складаныя сацыяльна-бытавыя праблемы заходнебеларускай рэчаіснасці, шматлікія грамадска-культурныя ініцыятывы патрыятычна настроенай моладзі, акцэнтаваў увагу на неабходнасці развіцця асветы на роднай мове. У вершах ён маляваў карціны прыроды, паказваў прыгажосць роднага краю, ставіў пытанні сацыяльнай і нацыянальнай справядлівасці, услаўляў спаконвечныя традыцыі і каштоўнасці беларусаў, паэтызаваў свабодалюбівыя імкненні адважных патрыётаў.

Творчасць К. Рагойшы таксама развівалася ў рэчышчы традыцыйнай лірыка-апавядальнай мастацка-стылявой плыні паэзіі Заходняй Беларусі. У аснове яго мастацкай свядомасці – выразны наратыўны прынцып мастацкага адчування і мыслення, паказ грамадска-побытавай сферы жыцця чалавека, галоўным чынам, канечне, селяніна, канкрэтна-прадметная вобразнасць, якія базіраваліся на выяўленні народнага ідэалу праўды і справядлівасці. У вершах К. Рагойшы пераважалі адлюстраванне падзей, публіцыстычная характарыстыка з'яў, перадача настрояў і пачуццяў лірычнага героя. Пры гэтым, мы бачым, паэт уважлівы да дэталей і падрабязнасцей, тонкіх змен і зрухаў у прыродным свеце і навольным асяроддзі. Напрыклад, ён са спачуваннем заўважае "Пад пакацістай гарою, / на пустыннай нетры, / дзе пясчынкі пераборам / прабіраюць ветры", адзінокую лазінку, якая "гнецца, бураю схіляна, / беднай сірацінкай":

Ля яе каберцам стала
парастаць травічка.
Людзі, знайце, што цячэ тут
блізенька крынічка [8, с. 13].

Ідучы ў рэчышчы традыцый і напрацовак яшчэ з нашаніўскага часу шматлікіх папярэднікаў, К. Рагойша заклікаў сваіх сяброў і аднадумцаў да працы: “За молат, мой браце, за молат!” (“За молат!”), “Ары й ары! А Божа міласць // Не праміне цябе, араты, – // Бог наш цябе за тваю шчырасць // Нагарадзіць жнівом багатым” (“Аратаму”). Праца таксама атаясамлівалася ў яго свядомасці з аб’яднаннем, кансалідацыяй маладых энергічных сіл дзеля барацьбы за свае правы, за праўду, сацыяльную і нацыянальную справядлівасць у краі, асацыіравалася з патэнцыяльным дабрабытам, свабодай і шчасцем:

У бяздоллі, у бязволлі
Дзён прыгоннае пары
Снуём ніці к яснай долі,
К дынамітнае зары!

Рук без ліку, рук гаротных –
Ўзварушыўся працы мах.
Загудзелі калаўроты…
Гэй, снуём радзімы сцяг! [8, с. 15].

Пры гэтым лірычны герой К. Рагойшы адрозніваўся бадзёрасцю духу, аптымістычным настроем, верай у перамогу высілкаў патрыятычна настроенай моладзі:

Праходзіць час драмання, –
На ўсходзе ўжо відней! –
Не час на нараканне,
А час працоўных дней!
………………………
Усе мы – ўсе! – да працы,
Хто толькі з нас узрос!
Сапраўды – толькі працай
Здабудзем сабе лёс [8, с. 19].

Разам з тым у шэрагу сваіх твораў К. Рагойша прыкметна адыходзіць ад лірыка-апавядальнага стылю, яго пісьмо набывае выразны праблемна-аналітычны характар. “Аб чым сніш, мой радзімы прастор, / Пад сцюдзёным, лядзяным цяжарам? – пытае лірычны герой верша “Зіма”. – Што гамоніш няўпынна, віхор, / Пушчам, сёлам, палям, цёмным хмарам?”. На першы погляд, пейзажная замалёўка неўпрыкмет перарастае ў сацыяльна-псіхалагічны відарыс, напоўнены глыбокімі духоўна-філасофскімі перажываннямі аўтара:

Не відаць сонца яснага з хмар…
Крылле ўзнялі паўночы вятрышчы
І з-за свету сплылі на папар,
Загулялі тут новае йгрышча [8, с. 15].

Верш заканчваецца яркім метафарычным малюнкам з глыбокім падтэкстам, якія пасяляюць у душы чытача надзею і веру на хуткі прыход вясны і шчасця:

Мароз душыць-гняце ўвесь прастор,
Пад палоззем скрыпіць і галосіць…
Гэй, памчаўся нязнаны віхор, –
З-пад стрэх новыя казкі разносіць [8, с. 16].

Вершы К. Рагойшы з асяродку іншых прадстаўнікоў масавай самадзейнай паэзіі Заходняй Беларусі вылучаліся выразным асобасным характарам, аўтарскайназіральнасцю, умельствам прыкмеціць і вылучыць у з'яве ці прадмеце пэўныя адметныя якасці і асаблівасці, засведчыць іх індывідуальнасць, паказаць іх у руху, развіцці, стварыць малюнак:

Прастор палёў. Дзе глянеш – межы.
Ўсё межы. Межы без канцоў.
Быллём папар заросшы, чорны,
Шапоча марнае жытцо…

А глянеш – панскі там абшар
Шуміць, як мора, буйным збожжам,
Бо пот сялянскі выліт там
І слёзы, кроў і труд паложан [8, с. 16].

Верш "Мінулае" змяшчае характэрныя прынцыпы бінарнай апазіцыі. Аўтар акцэнтуе ўвагу на сацыяльным кантрасце: з аднаго боку – вузкія зямельныя надзелы беднаты, межы, у быллі чорны зарослы папар, "марнае жытцо", нэндза, "народ-бунтар", а з другога – панскі абшар, які "Шуміць, як мора, буйным збожжам", панская зграя, цемра і прымус...

Актыўная грамадска-культурная дзейнасць, паэтычная творчасць, сацыяльныя і нацыянальныя матывы ў ёй, заклікі да барацьбы за свабоду і незалежнасць зрабілі К. Рагойшу вядомай маладой асобай у ваколіцах Ракава. «Мясцовыя польскія ўлады па-свойму заўважылі здольнага юнака з Пярэжар, – адзначае вядомы літаратуразнаўца і пляменнік паэта Вячаслаў Рагойша. – Пачаліся ўгаворы "пернікам", запалохванні "пугай" – перайсці ў творчасці на польскую мову. Калі гэта не дапамагло, сталі пагражаць перасяленнем ўсёй рагойшынскай сям'і з "крэсаў" у глыб Польшчы. Сталі знішчаць (паліць у печы ў прысутнасці Косці і яго родных) дасланыя з Вільні беларускія кнігі і перыядычныя выданні. Накладалі на сям'ю штрафы за абы-што, праводзілі вобыскі…» [8, с. 10].

Падчас вайны К. Рагойша працаваў настаўнікам Пярэжарскай пачатковай школы. У 1943 г. скончыў Віленскую настаўніцкую семінарыю.

Пасля вайны працаваў настаўнікам спачатку Пярэжарскай пачатковай школы, затым Выганіцкай школы, а пазней дырэктарам Пугачоўскай сямігодкі, завочна вучыўся на філалагічным факультэце Гродзенскага педагагічнага інстытута.

13 чэрвеня 1948 г. быў арыштаваны ў вёсцы Пугачы і 20 верасня 1948 г. асуджаны пазасудовым органам МДБ за "антысавецкую агітацыю" і "работу настаўнікам" у час нямецкай акупацыі на 10 год папраўча-працоўных лагераў і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены ў 1954 г.

Памёр, верагодна, 15 кастрычніка 1964 г.

Цалкам рэабілітаваны Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь 21 студзеня 1992 г.

**Высновы.** Творчыя пошукі Петруся Граніта, Юльяна Сергіевіча і Кастуся Рагойшы з'яўляюцца прыкметнай старонкай літаратурнай гісторыі Заходняй Беларусі. Яны выяўлялі вострыя праблемы і супярэчнасці заходнебеларускай рэчаіснасці, раскрывалі характэрныя асаблівасці духоўна-сацыяльнай свядомасці беларускага народа на адным з самых складаных этапаў яго гістарычнай жыццядзейнасці па шляху да дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту. Іх вершам былі ўласцівы натуральнасць лірыка-апавядальнага дыскурсу, дакладная перадача думкі і настрою, прадметна-пачуццёвая канкрэтнасць і выразнасць, характэрная плоцевасць слова. Яны вызначаліся яскравасцю вобразнага малюнка, пэўнай свабодай мастацкай формы, ростам публіцыстычнай напружанасці паэтычнай мовы, пластыкай рытміка-інтанацыйнага гучання.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Калеснік, У. Лёсам пазнанае: выбраныя літаратурныя партрэты і нарысы / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 557 с.
2. Ростані волі: з заходнебеларускай паэзіі / уклад. і аўтар прадмовы У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 415 с.
3. Граніт, П. Кінь нуду і бяду! / П. Граніт // Шлях моладзі. – 1938. – № 17. – С. 23.

4. Каханоўскі, Г. А. Сергіевіч Юльян / Г. А. Каханоўскі // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. / Ін-т літ. Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. Энцыкл. – Мінск, 1995. – Т. 5. – С. 303.

5. Сергіевіч, Ю. За волю нашых родных хат: вершы / Ю. Сергіевіч; уступ. слова і публ. Г. Каханоўскага // Полымя. – 1991. – № 7. – С. 145–148.

6. Сергіевіч, Ю. Дуб / Ю. Сергіевіч // Маладое жыцьцё. – 1922. – № 3. – С. 19.

7. Юл. Сергіевіч. “Успаміны” і іншыя творы з матываў вясковага жыцця” // ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 798.

8. Рагойша, К. Нам сняцца сны пра Беларусь: вершы, эсэ, успаміны / К. Рагойша, А. Рагойша. – Мінск: Кнігазбор, 2008. – 152 с.

## References

1. Kalesnik U. *Known by fate: selected literary portraits and essays.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1982. 557 p. (in Belarusian).

2. Kalesnik U. (comp.). *Rostani voli: from Western Belarusian poetry.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1990. 415 p. (in Belarusian).

3. Granit P. Quit boredom and trouble! *Shlyakh moladzi* [The Way of Youth], 1938, no. 17, p. 23 (in Belarusian).

4. Kakhanouski G. A. Sergiyevich Yulian. *Belarusian writers: biobibliography vocabulary. Vol. 5.* Minsk, 1995, p. 303 (in Belarusian).

5. Sergievich Yu. For the sake of our native houses: poems. *Polymya* [Flame], 1991, no. 7, pp. 145–148 (in Belarusian).

6. Sergievich Yu. Oak. *Maladoe zhytstse* [Young Life], 1922, no. 3, p. 19 (in Belarusian).

7. Yu. Sergievich. “Memories” and other works from the motifs of village life”. *Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 23. Op. 1. Rep. west 798 (in Belarusian).

8. Ragoisha K., Ragoisha A. *We have dreams about Belarus: poems, essays, memories.* Minsk, Knigazbor Publ., 2008. 152 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Микулич Николай Владимирович** – кандидат филологических наук, доцент, заведующий отделом взаимосвязей литератур. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: mikmik43@gmail.com.

## Information about the author

**Mikalai U. Mikulich** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Head of the Department of Literature Interrelations. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: mikmik43@gmail.com.